

# “Зямля нарадзіла, зямля ўзнагародзіла, зямля ўзбагаціла”, або Сакральныя аспекты стаўлення да зямлі



РЕПОЗИТОРИЙ

**У традыцыйнай культуры беларусаў зямля ўспрымалася як родны кут, родная старонка, Радзіма, як месца нашага часовага існавання на гэтым свеце і як магіла — месца вечнага спачыну. Таму з такой павагай і нашы продкі, і нашы сучаснікі ставяцца да наведвання могілак, карпатлівага шчыравання вакол іх на пачатку цыкла сельскагаспадарчых работ і напрыканцы яго.**

Прычым у пахавальным абрадзе зямля была і застаецца адным з асноўных рытуальных атрыбутаў (апошнім рытуальным дзеяннем развітання з нябожчыкам з’яўляецца трохразовае кіданне жменькі зямлі ў магілу), які надзяляецца неверагоднымі магічнымі і прароцкімі здольнасцямі. У адпаведнасці са старажытнымі славянскімі ўяўленнямі, цела чалавека было ўтворана з зямлі, таму пасля смерці душа яго адляціць у Нябёсы, а цела хаваюць у зямлю: “Бог сатварыў чалавека з зямлі, то ён зямля і ў зямлю пойдзе”. Сярод беларусаў існуе павер’е, быццам зямля дае збавенне ад працяглых перадсмяротных мучэнняў і спрыяе лёгкаму пераходу цяжкахворых людзей у свет продкаў. Калі чалавек доўга мучыўся, яго выносілі ў двор і клалі на зямлю або прыносілі крыху зямлі і сыпалі яму на грудзі. І сёння беларусы перакананы: калі ў час пахавання нечакана абсыплецца край магілы, то гэта неабвержнае сведчанне, што на працягу года з гэтай сям’і пойдзе на “той” свет яшчэ хто-небудзь.





У народзе казалі, што зямля не прыме злых людзей, калдуноў, ведзьмакоў, самагубцаў, таму перад іх пахаваннем выконвалі адпаведны рытуал “ачышчэння” ад брыдоты іх зямнога жыцця. Яшчэ пры жыцці пра такіх людзей казалі: “Як толькі яго зямля носіць”, “Каб вас святая зямля не прыняла!”

## І сілу дасць…

Па меркаваннях славян, зямля, у якой пахаваны сваякі, валодае незвычайным энергетычным патэнцыялам. Калі ўзяць жменю зямлі з сямі магіл, то яна будзе засцерагаць добразычлівых людзей, ратаваць усіх сваякоў ад бяды і напасцей.

Лічылася, што кепскую, нясмачную ваду, непрыдатную для ўжывання, можна было выправіць, кінуўшы ў яе жменю “бацькоўскай” зямлі: “Выпраўляючыся ў чужую старану, бяруць з сабою жменю роднай зямлі, каб высыпаць яе на чужыне ў крыніцу, калі вада там нясмачная”.

Для таго, каб адшукаць каля хаты “ваданоснае” месца для будучага калодзежа, на ноч на зямлю раскладвалі скруткі пражы ці патэльні. Па ступені вільготнасці — “земляным поце” — варажылі пра наяўнасць або адсутнасць падземных “ваданосных жыл”.

Людзі, якія адпраўляліся ў далёкую дарогу або пераязджалі на новае месца жыхарства, таксама бралі з сабой жменю роднай зямлі і звярталіся да яе з просьбай аб уратаванні: “Маці — сыра Зямля, спасі мяне, на цябе надзея, спасай нас...” Калі здаралася, што чалавек паміраў на чужыне, то крыху роднай зямлі абавязкова сыпалі яму на магілу.



На Віцебшчыне знаўцы народных традыцый вучылі: калі на працягу сямі дзён на світанні сабраць зямлю з сямі магіл “добрых” нябожчыкаў, то гэтая зямля будзе ратаваць ад усялякіх напасцей, маланкі, хвароб і ранняй смерці.

Калі хто-небудзь з мужчын ішоў на вайну, то перад хатай выконваўся наступны рытуал. Чалавек босай нагой пакідаў на зямлі след, маці або жонка збіралі гэты адбітак на чысцюткую хусціну, завязвалі на два вузлы і неслі ў хату за бажніцу. Людзі верылі, што з такім чалавекам нічога не здарыцца, таму што яго будуць ахоўваць родная зямля і чырвоны кут. Калі ж чалавек вяртаўся дадому, зямлю высыпалі на тое ж месца, адкуль бралі.

У дзень першага выгану кароўкі ў поле пастухам абавязкова нешта дарылі (кусок палатна, ручнік і інш.) і абавязкова частавалі яечняй, пірагамі, тварагом, але ўсе падарункі ніколі не давалі ў рукі. Неабходна было ўсё, што дарылася пастуху, пакласці на зямлю. Такія дзеянні рабіліся, каб засцерагчы хатнюю скацінку ад хвароб, ваўкоў на ўвесь час летняга выпасу. А зямля выступала своеасаблівым гарантам у гэтай “дамове”.

Цікава, але, калі неабходна было вырашыць якую-небудзь складаную спрэчку і даказаць сваю праўдзівасць, чалавек кляўся зямлёй. Той, хто лічыў, што праўда за ім, браў у рукі ці ў рот зямлю або клаў крыху сабе на галаву. Пры гэтым ён ведаў, што падман недапушчальны, бо з вуснаў у вусны передавалася перасцярога: за яго чалавек тут жа пачарнее як зямля.

Народныя лекары ведалі, што самым цяжкім быў праклён маці. Ні адзін знахар выгаварыць яго не мог. Выратаванне прыходзіла толькі тады, калі сын або дачка станавіліся на калені і з’ядалі жменьку зямлі або тройчы цалавалі яе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Даволі часта народныя лекары выкарыстоўвалі зямлю для лячэння розных захворванняў. Асаблівая магічная сіла прыпісвалася зямлі, узятай на скрыжаванні дарог, з першай баразны, з-пад нагі, калі вы ўпершыню бачылі ластаўку, бусла або пачулі зязюлю. Крыху гэтай зямлі клалі на галаву хворага і прамаўлялі такія словы: “Як здарова зямля, так бы і мая галава не балела”. У этнаграфічнай літаратуры апісана шмат выпадкаў, калі чалавека, якога ўдарыла маланка, на нейкі час закопвалі ў зямлю, і ён ажываў.



## ...і шчасце прынясе ў хату

Адным іх найважнейшых аспектаў, якія абавязкова ўлічвалі пры будаўніцтве новай хаты, быў выбар удалага (правільнага, шчаслівага) месца. Лічылася, што менавіта яно забяспечыць гаспадарам шчаслівы лёс і сямейны дабрабыт. Нездарма на Палессі гаварылі, што хату варта ставіць там, “дзе цёплая зямля і паветра”.

Добрым лічылася тое месца, дзе збіралася хатняя птушка, дзе апоўдні адпачывала скаціна. Ва Украіне для гэтай мэты кароў і авечак выпускалі спецыяльна іназіралі: там, дзе яны ўлягуцца, абавязкова ўзводзілі хату.

Адным з найбольш спрыяльных лічылася месца, на якім быў мурашнік. Мурашыную сям’ю пераносілі на іншае месца і некаторы час сачылі за тым, як хутка мурашкі абжывуцца, што лічылася добрай прыкметай і своеасаблівым блаславеннем нябёсаў.

Новую хату ніколі не будавалі на зямлі:

— дзе былі магілкі або на старых і разбураных месцах пахавання;

— дзе было здзейснена забойства чалавека;

— на месцы выкарчаванага саду, калі для ўзвядзення хаты даводзілася высякаць хоць адно пладовае дрэва: гэта лічылі дрэнным знакам;

— на старых, закінутых дарогах і скрыжаваннях;

— на месцы, дзе адбываўся які-небудзь сімвалічны разрыў (разлом), напрыклад мяжа паміж прысядзібнымі ўчасткамі, агародамі і да т.п.;

— на месцы старога млына або калодзежа;

— вельмі непажаданым было ўзвядзенне новай хаты на месцы, звязаным з агнём: на пажарышчы або там, куды трапіла маланка.

У народнай культуры існавала ўяўленне пра так званыя “нячыстыя” месцы, у якіх таксама нельга было пачынаць будаўніцтва новай хаты. Да іх звычайна адносіліся: нізкія, багністыя месцы; смеццевыя звалкі, бойні і жывёльныя могільнікі.

На жаль, менавіта зямля можа стаць першапрычынай шматлікіх бед і няшчасцяў. На зямлю людзі, якія валодаюць чорнай магіяй, могуць нагаварыць замовы, якія прынясуць непапраўную шкоду. І калі вы знайшлі пад парогам сваёй хаты зямлю, трэба ведаць, што яе нельга прыбіраць “голымі” рукамі. Яе неабходна старанна сабраць, вынесці на скрыжаванне дарог і па магчымасці спаліць. Пасля гэтага абавязкова прачытаць ахоўныя малітвы і замовы, а потым умыцца крынічнай або калодзежнай вадой, выцерціся падолам ці рукавом кашулі.

Калі будзеце купляць зямлю (прысядзібны ўчастак, дачу і г.д.), трэба ведаць, што найлепш разлічвацца дробнымі грашыма. Гэтым вы паспрыяеце свайму дабраму ўраджаю на гэтай зямлі.

Пачынаючы першую пасадку на вашым агародзе, не забудзьцеся зрабіць наступнае: у яснае надвор’е, каб былі відаць зоркі, трэба абысці агарод крыж-накрыж і прашаптаць: “Зямля нарадзіла, зямля ўзнагародзіла, зямля ўзбагаціла. Маці Божая, захавай. Амін”.

Уся глыбіня адносін паміж зямлёй і чалавекам адлюстравана ў наступных словах з адной цудоўнай беларускай легенды: “Зямля святая, яна наша маці, яна нас жывых корміць, а па смерці да сябе прыхіляе”.

**Аксана КАТОВІЧ**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА**



РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ